# ДЗЕНЬ ДОБРЫ, СЕСІЯ!

★ ★

## УПЭЎНЕНЫЯ АДКАЗЫ

У разгары заліковая сесія ў студэнтаў другога курса біёлага-глебавага факультэта. Скажу адразу, што яна складаная для нас.

На працягу першага семестра мы вывучалі тэарэтычны курс анатоміі чалавека Ён — нялёгкі, і тым не менш залік па гэтай дысцыпліне прайшоў для нас паспяхова. З першай спробы здалі ўсе Добрае веданне праграмнага матэрыялу паказалі Аляксандр Ярмішын, Фёдар Ізмайлаў, Павел Уласаў, Галіна Капецкая і Тамара Карповіч.

Не меншай складанасцю адрозніваўся ад анатоміі і залік па фізіцы На працягу семестра мы выканалі дзевяць кантрольных работ. Па іх тэматыцы праходзіў і залік. Аднымі з першых выканалі вучэбны план Людміла Дударава, Аляксандр Кіенл і Валерый Стральчанка.

Залік па фізіцы прынёс некаторыя непрыемнасці Галіне Нечыпарэнка і Наталлі Журавай. Дзяўчаты не ўклаліся ў тэрміны выканання работ, але і для іх гэтая прыступка цяпер — пройдзены этап.

Наша група нядрэнна пачала сваю трэцюю універсітэцкую сесію. Мы прыкладзем усе намаганні, каб закончыць яе паспяхова.

**З. ЛЯПЕЙКА,**
**студэнтка 2 курса біёлага - глібавага факультэта.**



Гэты здымак зроблен на заліку па гісторыі СССР. Спакойна, абгрунтавана адказвае выдатнік вучобы, студэнт трэцяга курса гісторыка - філалагічнага факультэта Вячаслаў Чымірка. І на гэты раз дацэнт Іван Апанасавіч Ільіных з задавальненнем зрабіў чарговы запіс у яго заліковай кніжцы.

## ПАЧАТАК РАДУЕ

Даўно вядома ісціна, як працуеш у семестры, такія вынікі і на экзаменацыйнай сесіі. Сведчаннем таму і залік па матэматычнаму аналізу, які здавалі першакурснікі фізічнага факультэта з групы Ф-15.

— Многія студэнты працавалі добрасумленна на працягу ўсяго семестра, — расказвае выкладчыца кафедры матэматычнага аналізу Святлана Іванаўна Буракоўская. Яны заўсёды акуратна наведвалі лекцыі, старанна канспектавалі матэрыял, вызначаліся на практычных занятках сваімі глыбокімі адказамі, актыўнасцю. Гэта перш за ўсё староста групы Я. Фірэр, камсорг А. Казловіч. Прыемна, што актывісты задавалі тон у вучобе, паказвалі прыклад сваім таварышам.

І як вынік старанай вучобы на працягу семестра Святлана Іванаўна з задавальненнем паставіла аўтаматычныя залікі, акрамя Я. Фірэра і А. Казловіча, яшчэ пецярым студэнтам. Гэта Е. Каралькова, А. Маслаў, І. Аструн, А. Сегень, Г. Панамарэнка. Многія з іх таксама не толькі добра вучацца, але і знаходзяць час для актыўнай грамадскай работы.

Сесія толькі пачалася. І вельмі прыемна, што ўжо першыя вынікі радуюць. Яны сведчаць аб тым, што студэнты групы Ф-15 паспяхова здадуць усю экзаменацыйную сесію.

**Наш кар.**



## З ДАПАМОГАЙ КУРАТАРА

Мы — першакурснікі. Будучыя геолагі. Многія з нас пасля доўгага перапынку ў вучобе прыйшлі ва універсітэцкія аўдыторыі. Да іх ліку адносяцца былыя воіны А. Грышын, А. Карзанаў і А. Старавойтаў.

Першая экзаменацыйная сесія паказвае, што рабяты сур'ёзна рыхтаваліся да яе прыходу. Своечасова здалі ўсе залікі В. Раманенка, Л. Фадзеева, Т. Гудкова і іншыя.

Многа ўвагі паспяховасці групы ўдзяляюць камсамольская і прафсаюзная арганізацыі і наш куратар Сцяпан Піліпавіч Ажгірэй. Ён многа гутарыць з намі, цікавіцца, што нам перашкаджае ў занятках, дапамагае парадамі.

**І. ХАЙБУЛІН,**
**праформ 12 групы геалагічнага факультэта.**

## КАБ БЫЛО НЕ ГОРШ

Сесія — праверка ведаў, атрыманых за семестр. Аб гэтым штодня памятаюць студэнты нашага факультэта. Сведчанне таму іх сур'ёзныя адносіны да вучобы. Юнакі і дзяўчаты актыўна ўдзельнічаюць у правядзенні семінарскіх заняткаў, якасна і ў тэрмін выконваюць заданні выкладчыкаў. Многія з нас займаюцца ў літаратурным і лінгвістычным гуртках. Як заўсёды, прыклад добрасумленных адносін да вучобы паказваюць нашы выдатнікі А. Лашкевіч, В. Сычоў, П. Раманенка, Л. Мікітчанка, В. Коваль, Т. Левіна і іншыя рабяты. Вучоба не перашкаджае ім актыўна ўдзельнічаць у грамадскім жыцці факультэта і універсітэта.

За кароткі тэрмін добра зарэкамендавалі сябе і першакурснікі, Хочацца верыць, што першую сесію ў сваім студэнцкім жыцці яны здадуць паспяхова. Сярод іх нам хочацца адзначыць В. Маляўка, Л. Булужэнкаву, Г. Матухіна.

Студэнты трэцяга курса беларускага аддзялення ў гэтым семестры выконвалі курсавыя работы па літаратуры. І выканалі нядрэнна. Аб гэтым красамоўна сведчаць лічбы — было напісана 49 работ, і толькі пяць з іх ацэнены здавальняючымі адзнакамі. Вышэйшы бал заслужылі Т. Петух, Л. Купрыянчык, Л. Бадалей, Л. Злобіна, Л. Гашко, Р. Зуева, Л. Ціхакава і Л. Безбабіч.

Усё гэта радуе нас, але нельга не расказаць аб тых, хто забывае пра асноўны студэнцкі абавязак — добрую вучобу. На жаль, і недобрасумленныя таварышы ёсць сярод нас.

Трывожнае становішча ў некаторых студэнтаў трэцяга курса, у прыватнасці з вывучэннем замежнай мовы. Спытаеце чаму? В. Дарашэвіч, В. Яцук не часта прыходзілі на заняткі, не папаўнялі свой слоўнікавы запас, не многа ўвагі ўдзялялі пазааўдыторнаму чытанню мастацкай літаратуры і газет. Паводзіны В. Дарашэвіча і В. Яцук разбіраліся на пасяджэнні акадэмічнай камісіі камсамольскага бюро факультэта. Яны строга папярэджаны. Але скажам шчыра, што такіх здарэнняў на гісторыка-філалагічным факультэце нямнога.

У мінулым навучальным годзе мы занялі першае месца па паспяховасці ва універсітэце. Гэты рубеж мы імкнемся замацаваць за сабою. Спадзяемся, што нашы намаганні ў вучобе дадуць вынікі не горшыя, чым у 1970—1971 навучальным годзе.

**У. ШЫРОКІ,**
**Г. ФІЛІПАВА,**
**Л. ДЗЕМЯНЦЕЙ,**
**студэнты 3 курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

ЯНЫ З ГДУ

## КРОКІ ДА МАРЫ

Восень 1970 года. З многіх краін Еўропы ў французскую сталіцу на чэмпіянат кантынента па лёгкай атлетыцы з'ехаліся юніёры. Парыжскія аматары каралевы спорту бачылі многіх зорак сусветнай лёгкай атлетыкі, увогуле да славутасцей ім не прывыкаць, і, тым не менш, усе дні спаборніцтваў на «Каломбе» бурлілі страсці.

...Страсці на старым стадыёне накаляліся. Хутканогі Перы ў бегу на 400 метраў з бар'ерамі ўклініўся паміж двума рускімі Ого, гэта ўжо прадвяшчала барацьбу ў эстафеце 4×400 метраў.

Трыбуны лічылі мінуты да старта. Гледачы на імгненне прыцiхлі, — успамінае Жэня. —Сухі шчаўчок стартавага пісталета зноў узняў іх з месц. На першым этапе ад нашай каманды бег Н. Карняушкін, Ён выканаў установку трэнераў — не адпусціць ад сябе сапернікаў. Карняушкін другім перадаў мне эстафету. Рвануўся ўперад. Ззаду метраў 75 — 80, і... усё цела сціснулася ад болю, на імгненне ў вачах пацямнела. Рашэнне прыйшло ў долі секунды — бегчы, бегчы ў што б там ні стала...

Тэмпераментныя французы, убачыўшы, што ў бегуна ў чырвонай майцы нешта здарылася, закрычалі яшчэ мацней.

— Этап я закончыў чацвёртым, Да правага бядра нельга было дакрануцца, надарваў прыводзячыя мышцы. Таварышы па камандзе, дзякуй ім, Стукалаў і Кочар ліквідавалі разрыў.

А праз дваццаць мінут на «Каломбе» зноў загучалі фанфары, і па флагштоку паплыў угору наш сцяг, суправаджаемы велічнай мелодыяй савецкага гімна.

З ДВАЙНЫМ ПАЧУЦЦЕМ пакідаў Парыж малады гамяльчанін: Жэня вяртаўся на Радзіму з нядрэнным багажом — залатым медалем за эстафету і бронзавым за бар'ерны бег. Гэта радавала, але да радасці прымешваўся ныючы боль у бядры — кожны крок даваўся з цяжкасцю. Траўма азмрочвала поспех.

— З нерадаснымі думкамі давялося заканчваць сезон,—расказвае Гаўрыленка. — На парозе перадалімпійскага сезона лячэнне адарвала многа часу.

Наступіў 1971 год. Не абяцаў ён лёгкага жыцця студэнту трэцяга курса факультэта фізічнага выхавання: лекцыі, залікі, экзамены, трэніроўкі, трэніроўкі...

— Да вясны ўдалося падлячыцца, — гаворыць Гаўрыленка. — З вялікімі планамі і надзеямі выходзіў на першыя старты, адчуваў, што паступова прыходзіць добрая форма.

Гэта было так. На першынстве вышэйшых навучальных устаноў Беларусі Гаўрыленка выйграе фінальны забег на 400 метраў з бар'ерамі — 50,3.

Наступны этап — Пятая спартакіяда народаў СССР. Толькі ветэран Вячаслаў Скамарохаў апярэдзіў беларускага бар'ерыста, але невядома, як бы скончылася барацьба, каб не было ў гамяльчаніна збою ў сярэдзіне дыстанцыі. Новы рэкорд Беларускай ССР (50,2) і сярэбраны медаль былі ўзнагародамі Яўгену за гэты бег. Але масквічы яшчэ раз апладзіравалі яму.

У эстафеце 4×400 метраў да апошняга этапа беларускія бегуны прыйшлі пятымі. Гаўрыленка прыняў эстафету ад Аляксандра Коннікава. Метрах у дваццаці наперадзе несліся да фініша расіянін, масквіч, украінец і ленінградзец. За апошнія дзве каманды беглі Насенка і Стукалаў. Той, хто сачыў за спартакіяднымі стартамі, памятае бег гомельскага студэнта — да сярэдзіны этапа Насенка і пастаянны сапернік апошніх год Дзмітрый Стукалаў засталіся ззаду, а беларускі квартэт пасля фінішу быў узна-

# ЗАГАДЧЫК СТАЛОВАЙ

Ежа на мой погляд, адыгрывае не апошнюю ролю ў вашым вучэнні і працы, дарагія сябры.

Вы можаце сказаць, аб чым гаварыць загадчыку сталовай, якая існуе трэці месяц? Я з вамі тут не згодзен — многім памятным будзе для нашага маладога калектыву першы год дзявятай пяцігодкі. Кожны з нас у ім прыйшоў на новае месца работы. І не на абы якое — універсітэцкая сталовая па сваіх умовах і абсталяванню з'яўляецца адной з лепшых на Гомельшчыне. І ўжо гэта абавязвае нас працаваць так, каб якасцю страў і іх асартыментам не псаваць бадзёры настрой нашых кліентаў.

Што зроблена за прайшоўшы час? Працуюць дзве залы сталовай, кулінарны магазін, чатыры буфеты, кандытарскі цэх забяспечвае сваімі вырабамі запытанні наведвальнікаў. Але ў нас ёсць і нявырашаныя пытанні — неўкамплектаванне штату, што перашкаджае адкрыццю трэцяй залы.

А цяпер аб тым, што чакае вас у 1972 годзе. У студзені плануецца адкрыццё трэцяй залы. Гэта дасць магчымасць паскорыць абслугоўванне. У ніжняй зале будзе арганізавана дыетычнае харчаванне. Павялічыцца і колькасць абсталявання ў нашых цэхах. У Новым годзе пашырыцца асартымент мясных, рыбных, гароднінных і беларускіх нацыянальных страў. Паспытаеце вы і нашы фірменныя вырабы. У сталовай уводзіцца харчаванне па абанементах.

Спадзяюся, што ўсе гэтыя мерапрыемствы будуць ажыццёўлены.

**Г. ЛОГІНАЎ,**
**загадчык сталовай № 40.**

# А. Р. КІНЗІКЕЕВУ—50 ГОД



1 студзеня 1972 года загадчыку кафедры агульнай геалогіі Ахцяму Рахматулавічу Кінзікееву спаўняецца 50 год. Нарадзіўся ён у Башкірыі ў беднай сялянскай сям'і, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, член КПСС з 1944 года, узнагароджан двума ардэнамі Чырвонай Зоркі і медалямі. У 1951 годзе скончыў з адзнакай Маскоўскі нафтавы інстытут, а ў 1955 годзе аспірантуру. З 1955 па 1969 год ён працаваў у навукова-даследчых арганізацыях Башкірыі і Татарыі і адначасова чытаў курс лекцый па агульнай і гістарычнай геалогіі ў Уфімскім нафтавым інстытуце. У 1956 годзе ўпершыню ў Савецкім Саюзе ім была арганізавана лабараторыя па вывучэнню нафтаноснасці карбанатных калектараў.

А. Р. Кінзікееву ў 1967 годзе прысуджана вучоная ступень доктара геолага-мінералагічных навук, а з 1969 года ён з'яўляецца прафесарам.

У 1969 годзе А. Р. Кінзікееў быў запрошан і з таго часу з'яўляецца загадчыкам кафедры агульнай геалогіі нашага універсітэта, а з лістапада 1970 па 1971 год быў дэканам геалагічнага факультэта.

Кінзікеевым напісана больш 60 апублікаваных навуковых і 30 рукапісных работ. Асноўныя яго навуковыя працы прысвечаны праблемам нафтаноснасці карбанатных калектараў, даследаванню фарміравання прамысловых скапленняў вуглевадародаў, распрацоўцы і ўдасканаленню метадаў пошукаў і разведкі гэтага каштоўнейшага карыснага выкапня, абгрунтаванню колькасных крытэрыяў перспектыўнасці на нафту зямель і яе ўчасткаў, ацэнцы прагнозных запасаў нафты, праблемам аховы недраў, эфектыўнага ўскрыцця, апрабавання і асваення свідравін у карбанатным разрэзе і г. д.

У выніку гэтых даследаванняў развіты прынцыпы рытмастраціграфіі і ўдасканалена рытмастраціграфічная методыка расчлянення і карэляцыі разрэзаў, упершыню зроблена дэталёвае расчляненне і складзена схема індэксацыі пластоў усяго палеазоя Татарыі і Башкірыі, якія могуць быць выкарыстаны ў Урала-Паволжы і ва ўсёй Рускай платформе; абгрунтавана наяўнасць чаргавання ў карбанатным палеазое пластоў-калектараў і некалектараў, даказана высокая перспектыўнасць на нафту сямілукска-бурэгскага, варонежскага, яўланаўскага, лівенскага, задонскага, ялецкага, лебядзінскага і данкоўскага гарызонтаў дэвона, заволжскіх пластоў, алексінскага, окска-серпухоўскага, кашырскага і іншых гарызонтаў карбона.

Па рэкамендацыях, выкладзеных у адпаведных справаздачах, адкрыта ў цэлым больш 30 нафтавых залежаў і месцанараджэнняў.

На аснове пералічаных вышэй даследаванняў, упершыню была дадзена ацэнка перспектыўных і прагнозных запасаў нафты Татарскай АССР і абгрунтаваны сумесна з Б. З. Фатахавым перспектывы развіцця нафтавай прамысловасці Татарыі на перыяд з 1963 па 1970 гады, даказана і ў 1970 годзе практычна пацверджана магчымасць дасягнення 100 мільёнаў тон нафты ў Татарскай АССР; праведзена даследаванне прынцыповай схемы развіцця нафтавай прамысловасці Беларусі, дадзены рэкамендацыі па павышэнню эфектыўнасці пошукаў, разведкі і распрацоўкі нафтавых месцанараджэнняў Беларусі.

Вялікую навуковую і педагагічную дзейнасць А. Р. Кінзікееў плённа спалучае з грамадскай работай. Ён з'яўляецца членам партыйнага камітэта універсітэта, членам Чыгуначнага РК КПБ, выступае перад насельніцтвам горада і вобласці з лекцыямі і дакладамі.

Дарагі Ахцям Рахматулавіч!

Мы ад усяго сэрца віншуем Вас з паўвекавым юбілеем і жадаем Вам добрага здароўя, далейшых творчых поспехаў і поспехаў па выхаванню маладых спецыялістаў-геолагаў!

**В. ГЕРАСІМАЎ,**
**загадчык кафедры інжынернай геалогіі і гідрагеалогіі, прафесар.**

# СЛУХАЧКА ПАДРЫХТОЎЧАГА АДДЗЯЛЕННЯ



Гомельскі дзяржаўны універсітэт. Паступленне на падрыхтоўчыя курсы пры ім было, бадай, самай значнай падзеяй у маім жыцці ў 1971 годзе. Да універсітэта я працавала сакратаром камітэта камсамола Бабруйскай швейнай фабрыкі імя Ф. Э. Дзяржынскага. Гэта цікавая і неспакойная работа і падказала мне дарогу да будучай спецыяльнасці педагога.

Планы на 1972 год? Мэта адна — паспяхова вучыцца, з добрымі вынікамі закончыць падрыхтоўчае аддзяленне і першага верасня ўвайсці ў аўдыторыю студэнткай першага курса гісторыка-філалагічнага факультэта.

**Л. ІЗМЕСЦЬЕВА.**



# ЛЕПШ, ЧЫМ У МІНУЛЫМ

Вялікую ролю ў ідэалагічным выхаванні моладзі адыгрывае рэгулярнае чытанне маладзёжных выданняў перыядычнага друку. Таму камітэт камсамола прыняў рашэнне кожнаму студэнту падпісацца не менш, чым на адно выданне перыядычнага друку. Найбольш якасна і своечасова правялі падпісную кампанію камсамольская арганізацыя біёлага-глебавага факультэта (сакратар камсамольскага бюро Я. Ляльковa), механіка-матэматычнага факультэта (сакратар камсамольскага бюро В. Крук), эканамічнага факультэта (сакратар камсамольскага бюро А. Сасноў). Гэтыя арганізацыі не толькі выканалі план падпіскі, але значна перавыканалі. А механіка-матэматычны факультэт амаль у 2 разы перавыканаў план падпіскі на газету «Гомельскі універсітэт».

Але яшчэ не на ўсіх факультэтах так добра абстаяць справы. У першую чаргу гэта адносіцца да студэнтаў факультэта фізвыхавання (сакратар камсамольскага бюро В. Сехін), якія нават не выканалі план падпіскі на газету «Физкультурник Белоруссии» (52 экземпляры), што пацягнула за сабой невыкананне плана падпіскі на «Физкультурник Белоруссии» у цэлым па універсітэту. Слаба прайшла падпісная кампанія ў камсамольскай арганізацыі фізічнага факультэта і геалагічнага факультэта. Гэта сведчанне таго, што адказныя за падпіску камсамольскіх бюро не звярнулі належнай увагі на гэта пытанне.

Камсамольскай арганізацыяй афармлена падпіска на 3.252 экземпляры газет і часопісаў, што перавысіла падпіску 1971 года больш, чым на 300 экземпляраў.

Хочацца адзначыць узрослую цікавасць студэнтаў да газеты «Гомельскі універсітэт». План падпіскі студэнтамі перавыканан на 200 экземпляраў. Але чамусьці газета «Гомельскі універсітэт» страціла папулярнасць сярод выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. Пры плане 245 экземпляраў супрацоўнікамі і выкладчыкамі універсітэта выпісана толькі 19, з іх кафедра філасофіі — 6 экземпляраў, кафедра палітэканоміі — 13 экземпляраў.

Як быць у курсе ўсіх падзей універсітэта астатнім выкладчыкам і супрацоўнікам?

**Я. БАБІЧАЎ,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола.**

гароджан бронзавымі медалямі.

Два спартакіядныя трафеі. Аб такім выступленні марыць кожны спартсмен, але ўперадзе быў еўрапейскі чэмпіянат легкаатлетаў.

— У Хельсінкі Стукалаў узяў рэванш, — успамінае Жэня. — Праўда, у папярэдніх забегах і ў паўфінале я быў першым, паўтарыўшы свой маскоўскі вынік. У фінале разлічваў на трэцяе месца, але фінішыраваў горш, чым чакаў, 50,5 хапіла толькі на пятае месца.

Не зусім удалае выступленне ў фінскай сталіцы падштурхнула бар'ерыста. Ён адчуваў, што знаходзіцца ў добрай форме, здольны на больш высокія секунды. Патрэбен быў вялікі старт для праверкі. Такім стаў матч СССР — ГДР — Польшча. Гамяльчанін бег за савецкую каманду ў эстафеце 4×400 метраў. На другім этапе ён паказаў 46,1. Гэта пацвердзіла пачуццё, надало ўпэўненасць у сваіх магчымасцях.

У ПАЧАТКУ ВЕРАСНЯ Мюнхен сустракаў удзельнікаў перадалімпійскага тыдня. Старты ў сталіцы будучай алімпіяды былі для Гаўрыленкі перадапошнімі ў напружаным сезоне 1971 года. Яны з'явіліся добрай праверкай падрыхтоўкі бегуна. Яўгеній палепшыў свой асабісты рэкорд, давеўшы яго ў фінальным забегу да 49,4 секунды.

У Мюнхене ўзору семдзесят першага савецкі спартсмен стаў пераможцам, перамог ён і ў Мемарыяле братоў Знаменскіх, у адсутнасць асноўных канкурэнтаў В. Скамарохава і Д. Стукалава.

— Цяжка было на беговай дарожцы, але не меншыя цяжкасці чакалі ва універсітэце,— прызнаецца Гаўрыленка.— Трэба было разлічвацца з хвастамі за трэці курс, за веснавую сесію. Цяпер гэта ззаду.

Спакойна, немнагаслоўна расказвае малады спартсмен пра сваіх таварышаў па вучобе і спорту, пра трэнера, выступленні на беговай дарожцы. Мы гутарым аб мінулым, аб яшчэ не забыўных уражаннях адыходзячага года. Выпадкова даведваюся, што па выніках сезона Яўгену прысвоена званне майстра спорту міжнароднага класа.

— Не было б гэтага поспеху, калі б восем год назад аднакашнік Жэня Наважэнцаў не зацягнуў мяне на трэніроўку і не пазнаёміў са сваім трэнерам Раманам Рыгоравічам Розенбергам, — з удзячнасцю гаворыць пра іх Гаўрыленка. У маленькай зале Палаца культуры завода «Гомсельмаш» пачаўся мой шлях у спорт.

НАСТАЎНІК Яўгена сам быў нядрэнным спрынтэрам, і бегу на кароткіх дыстанцыях ён пачаў навучаць навічка, а неўзабаве вырашыў, што росламу школьніку да твару будуць бар'ерныя дыстанцыі.

За пяць год Гаўрыленка прайшоў шлях ад навічка да майстра спорту. Быў чэмпіёнам Усесаюзнай спартакіяды школьнікаў у бегу на 400 метраў і 110 метраў з бар'ерамі.

— Але, відавочна, маё прызванне — 400 метраў з бар'ерамі, — гаворыць спартсмен, — вызначыць яго дапамог Раман Рыгоравіч. Многае ён значыць для мяне ў жыцці — трэнер, добры дарадчык, старэйшы таварыш. Раман Рыгоравіч сочыць за маёй вучобай, цікавіцца, як і дзе праводжу вольны час, што чытаю. Мне цяжка назваць тое, што ўходзіць з-пад увагі майго настаўніка.

Так гаворыць спартсмен пра чалавека, які даў яму пуцёўку ў вялікі спорт. Але ж не з меншай павагай адгукваецца трэнер пра свайго выхаванца:

— Жэня — працаўнік, сумленны, засяроджаны, упарты і настойлівы. Не сакрэт жа, што спорт аднімае ў яго вельмі многа часу, але гэта не адбіваецца на вучобе (у школе ён вучыўся без троек). Не адстае ён і зараз. Яўген у свае 20 з невялікім год вядомы ў нашай краіне, але поспехі не змяншаюць яго сціпласць, і, упэўнен, будучыя перамогі не ўскружаць яму галаву.

МЫ ЧАСТА пытаем, у чым сакрэт поспеху чалавека ў навуцы, працы, спорце, што рухае яго да мэты, хто вядзе яго да поспеху, які ты сам на дарозе да сваёй мары. Па-рознаму адказваюць людзі. І ў гэтых двух выказваннях— спартсмена і яго настаўніка — гучыць, па-мойму, адказ на пытанне.

1972 год на парозе нашага жыцця. Напружаным, цікавым і цяжкім быў яго папярэднік для Я. Гаўрыленкі.

Год жыцця чалавека. Многа гэта ці мала?

Перадалімпійскі сезон вывёў гомельскага студэнта на трэцяе месца ў Еўропе. Аб такіх выніках мараць многія спартсмены. Іншая думка ў маладога спартсмена — ён лічыць, што яго шлях да спартыўных вяршынь толькі пачынаецца:

— Алімпійскі год — адказны перыяд для кожнага савецкага спартсмена, — дзеліцца сваімі думкамі Яўген, — будзе многа клопатаў і ў мяне. Галоўны з іх — добра падрыхтавацца да сезона і заваяваць права выступаць за зборную каманду Савецкага Саюза ў Мюнхене.

У памяці кожнага савецкага чалавека працаўнік семдзесят першы пакіне аб сябе добры след. Будзе яго чым успомніць і Яўгену: здадзенымі залікамі і экзаменамі, пераможнымі стартамі і рэкордамі, надзеямі і сумненнямі, крокамі да сваёй мэты...

**Р. ПІНСКІ.**

